

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№11(127)

1 жніўня 2014

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

ЯК ЗГУБІЛАСЯ І ДЗЕ ЗНАЙШЛАСЯ КУЛЯШОЎСКАЯ ЦАРКВА

Таямніца знікнення старажытнага драўлянага помніка клімавіцкай мінуўшчыны

Ясь ГАСПАДАР

Дакументы сведчаць, што да рэвалюцыі 1917 года ў Клімавіцкім павеце налічвалася 9 каменных храмаў і 43 драўляных. У савецкія часы, калі запанаваў прымусовы атэізм, амаль усе іх зруйнавалі. Вось што казалі з гэтай нагоды клімавіцкія краязнаўцы: "XX стагоддзе з'явілася знішчальным для большасці помнікаў храмавай архітэктуры. Не сталі выключэннем і шматлікія драўляныя і каменныя будынкі — яны на сённяшні дзень ужо не існуюць". А вось ад Ільінскай царквы з вёскі Куляшоўка на Клімаўшчыне пазбавіліся параўнальна нядаўна.



Куляшоўская Ільінская царква, або Ільінская царква у вёсцы Куляшоўка, была пабудавана ў 1893 годзе. Яна стаяла на паўночна-ўсходнім ускрайку вёскі, на самым высокім месцы. За яе прыгажосць царкву ўключылі ў "Звод помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" як помнік драўлянага дойлідства.

Яшчэ ў савецкі час архітэктурнае апісанне царквы трапіла ў кнігу "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць", выдадзеную у 1986 г. Галоўным упрыгожваннем будынка былі два купалы з крыжамі пад колер золата. Будынак меў тры ўваходы — галоўны і два бакавыя, аформленыя вялікімі ганкамі з масіўнымі слупамі і фігурнымі франтонамі. Пластыку фасадаў узбагачалі карнізы, выдатная разьба. На рэлігійныя святы збіраліся тысячы людзей.


Пасля рэвалюцыі Ільінскую царкву зачынялі, потым дазвалялі, а канчаткова яна спыніла дзейнасць пры Хрушчове ў 1960 г. Паступова будынак старэў, абрушыўся адзін царкоўны купал. А ў 2004 годзе нечакана высветлілася, што царква з Куляшоўкі знікла цалкам. Пачалі казаць, што яе разабралі на дровы або проста знішчылі. Нарэшце справай зацікавіліся ў Міністэрстве культуры, бо ўсё ж Ільінская царква дасюль знаходзілася ў афіцыйна зацверджаным спісе помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Вось як аб гэтай сітуацыі паведамлялася ў рэспубліканскай газеце "Культура":

"Паводле беларускага заканадаўства, працы на аб'екце спадчыны не могуць распачынацца без удзелу навуковага кіраўніка. На практыцы ж ён можа даведацца пра іх правядзенне ўжо постфактум. У адзін цудоўны дзень навуковы кіраўнік царквы Святога Іллі ў вёсцы Куляшоўка Клімавіцкага раёна раптам даведалася, што гэты помнік спадчыны... бясследна знік! Быццам скрозь зямлю праваліўся...".

Вядома, што такое "адкрыццё" выклікала шэраг пытанняў, пачаліся рабіцца запыты па афіцыйных і неафіцыйных каналах. Як піша "Культура": "Праз нейкі час царква "знайшлася", але ўжо ў Бабруйску. Уласнік помніка спадчыны не палічыў патрэбным паведаміць пра перанос апошняга не толькі навуковаму кіраўніку аб'екта, але і ў Міністэрства культуры краіны, без дазволу якога ніякія работы на гісторыка-культурных каштоўнасцях не маюць законнай асновы".

Сапраўды, царква з Клімавіцкага раёна пераехала ў Бабруйск (адшукаць яе можна на вуліцы Сікорскага, 38). Спецыялісты адзначаюць, што праведзеная рэканструкцыя будынка поўнасцю змяніла яго гістарычнае аблічча. Сёння гэта дзейны праваслаўны храм, які знаходзіцца пад ахавай дзяржавы.

З аднаго боку, добра, што Куляшоўская царква засталася жыць і зноў выкарыстоўваецца вернікамі. Але з іншага боку, Клімавічы згубілі цудоўны помнік нашай старажытнасці, якіх на клімавіцкай зямлі і так зусім не засталося.



РАСКИДАННОЕ ГНЕЗДО

Чиновники забрали детей из семьи Моцных

Тимур НЕЗВАНОВ

Чтобы добиться выполнения своего решения, климовичские чиновники оказались готовы пойти на всё. Даже на применение милиции против беззащитной женщины и маленьких детей. Неужто тем, кто давал добро на подобные действия, абсолютно всё равно, что думают об этом в городе да и во всей Беларуси?



«МЕНЯ И СЫНА ЗАДЕРЖАЛИ»

За последние дни забрать приемных детей из детского дома семейного типа, где жила семья Моцных, пробовали несколько раз. Как говорят представители Климовичского районного отдела образования, делалось это потому, что Ирину Моцную лишили права быть приемной матерью. Но женщина требовала, чтобы всё было сделано по закону, а дети, в свою очередь, упрашивали чиновников оставить их в семье.

Рано утром в прошлую пятницу Ирину Моцную и её родного сына Виталия задержали. Об этом TUT.BY успела сообщить сама Ирина: «Мы с детьми сегодня утром на машине выехали в Минск. Наш старший приемный мальчик Саша собирался подавать документы в училище, и мы поехали его поддержать. Проехали 12 километров от Климовичей, и нас остановили сотрудники милиции, сказали, что нужно ехать домой. Когда мы вернулись к дому, меня и сына задержали, а дети бросились врассыпную. Где они сейчас, я даже представить не могу».

Ирину, Виталия и 16-летнего приемного мальчика Сашу Пугачева доставили в Климовичский РОВД, где продержали 11 часов, отпустив ближе к вечеру. В пресс-службе УВД Могилёвского облисполкома TUT.BY пояснили, что, согласно решению Климовичского райисполкома, Ирина Моцная больше не является законным представителем детей, поскольку была уволена с должности приемного родителя-воспитателя. Моцную задержали, чтобы выяснить, почему она самовольно, не являясь законным представителем детей, попыталась вывезти детей, добавили в УВД.

ПИСТОЛЕТ И НАРУЧНИКИ

О том, что произошло в этот день, Ирина и дети рассказали Екатерине Синюк (TUT.BY): «Когда мы подъехали к дому, вышли, сразу руки заломили Саше и Витале. Было больше десяти сотрудников милиции. Сразу четверо набросились на Виталика. Он вырывается, они ещё больше заламывают его, бьют, я упала. Сашка потом кинулся спасать Виталю, потом кинулась Наташа, удочеренная наша девочка. Все вместе с милицией мы упали на забор. Я кричала, чтобы не трогали моих сыновей. Один милиционер выхватил пистолет из кобуры. У него было такое безумное лицо! Я снова стала кричать, и только тогда он спрятал его!».

По словам Виталия, как только он вышел из машины, на него надели наручники без объяснения причин: «Не знаю, за что меня крутили, за что наручники мне надели. Конечно, я сопротивлялся, мне же не объяснили, за что меня. Маме что-то они ещё объясняли, а лично мне — ни слова».

Ирина с ужасом вспоминала: «Дети, как воробышки, разлетелись! Часть в бане закрылись на замок, часть куда-то ещё дальше побежали. Милиция за ними. Это полицейский район какой-то! Где высшие власти? Где Минск? Где все? Такое творить! Я реально чувствовала себя, как в гестапо!». А вот, по мнению чиновников, дети находятся в полной безопасности. Об этом TUT.BY уведомила заместитель председателя Климовичского райисполкома Екатерина Музыченко: «Мы все заинтересованы в судьбе детей. Они находятся в безопасности, в учреждении для детей, для них созданы комфортные условия. Они находятся не в приюте, а в учреждении для деток. Находятся все вместе, никто их не разбрасывает по детским домам. Сейчас самая основная задача — снять у них психоэмоциональное напряжение».

НЕКАЯ БУМАГА БЕЗ ПОДПИСИ

Таким образом, детей у Ирины всё-таки забрали, а ей вручили повестку в суд. Женщина не знает, что она услышит в суде. И до сих пор не понимает, за что её лишили статуса приемной матери: «Единственное, что я видела, — это некая бумага, без единой подписи, где было сказано, что я уволена и заодно отстранена от обязанностей опекуна за ненадлежащее исполнение своих обязанностей. Никаких доказательств этому местные чиновники мне так и не смогли представить. Ужасней всего, что их совершенно не интересовало и мнение детей».

Что касается детей, то они с плачем и криком умоляли оставить их в семье Моцных. Но волнует ли это тех, кто равнодушен к детским слезам и чужой боли?

P.S. 28 июля должен был состояться суд с участием Ирины Моцной. Но в этот день Климовский районный суд не стал проводить заседание из-за непоступления материалов административного дела из милиции. В ожидании разбирательства женщина пережила гипертонический криз, к ней была вызвана машина «Скорой помощи» для оказания медицинской помощи. Пока неясно, когда состоится суд, так как состояние здоровья Ирины Моцной не позволяет ей принять участие в судебных заседаниях. И, похоже, время для подготовки также требуется и Климовичскому РОВД.



БЫВШИЙ НАЧАЛЬНИК КЛИМОВИЧСКОГО РОВД ЗАЯВЛЯЕТ, ЧТО ЕГО ПОДСТАВИЛИ

Александр ВЛАД

В четверг 24 июля информационная кампания БелаПАН поделилась новостью, которая немедленно стала хитом интернета. Десятки сайтов, блогов и социальных сетей в тот же самый день пересказали о том, что бывший начальник Климовичского РОВД заявляет о фальсификации его уголовного дела. Осужденный на 11 лет лишения свободы Александр Артеменко обратился в независимые СМИ, так как официальные инстанции игнорируют все его жалобы.

Журналист БелаПАН Владимир Лапцевич напомнил, что в марте прошлого года Борисовский межгарнизонный военный суд приговорил бывшего начальника Климовичского РОВД Артеменко к 11 годам колонии усиленного режима. Одновременно вместе с ним были осуждены ещё два климовичских правоохранителя. Суд, проходивший за закрытыми дверями, пришёл к выводу, что их вина полностью доказана.

И вот, спустя полтора года после вынесения приговора, Александр Артеменко решил открыто объявить, что дело было сфальсифицировано. «Я, в соответствии с законодательством Республики Беларусь и требованием Верховного суда, осуждён незаконно, и фальсификация материалов уголовного дела послужила незаконному приговору», — написал Артеменко в своём обращении к средствам массовой информации.

Сделать это сейчас он решил по той причине, что все его попытки добиться справедливости по официальным каналам не имели успеха. По словам осужденного, во время суда все его ходатайства необоснованно отклонялись. «Судья (Любовицкий. — БелаПАН.) изложил: показания Артеменко не принимать во внимание, так как пытается уйти от ответственности. Это когда я свои показания могу подтвердить из нескольких независимых источников и документально. Вот как соблюдаются в закрытых судебных процессах права человека, Конституция РБ, УПК», — отмечается в обращении экс-начальника РОВД.

Артеменко утверждает, что никаких денег от гражданина России он не получал, его просто «круто подставили». Тем не менее, согласно приговору суда, Артеменко якобы реализовал полученные от россиянина деньги, покупая имущество родителям на 600 млн. рублей. Это является ложью, отмечает бывший милиционер.

По его утверждению, он второй год пытается добиться проверки своих показаний и доводов, однако ответы приходят, что всё в отношении него было сделано законно. «Я, как человек 15 лет отработавший в системе МВД, с достоверностью могу доказать свою невиновность и преступления, совершённые сотрудниками УСК, но жалобы мои просто игнорируются», — говорится в обращении.

«Хотите знать почему? Отвечаю: ряд высокопоставленных чиновников силовых структур будут уволены с должностей, свыше 10 сотрудников УСК и УБОП, занимающихся фальсификацией уголовного дела, сядут на скамью подсудимых», — заявляет Александр Артеменко, не называя при этом фамилий.

В суд была представлена искажённая финансовая информация, рассказала БелаПАН Лидия Артеменко, мать осужденного. «Однако его обжалования не рассматриваются. Пишут, что всё законно, и отправляют назад», — утверждает женщина. Она надеется, что, возможно, после обращения к СМИ жалобы её сына относительно обстоятельств уголовного дела «начнут читать».



КОММЕНТАРИЙ «КЛІМАВІЦКАЙ ІНФА-ПАНАРАМЫ»:
Бывший подполковник милиции имеет полное право на то, чтобы выслушали его самого, а также приводимые им доводы и доказательства. Но заметим, что если Артеменко считает, что его подставили, он должен назвать фамилии тех людей, которые, по его мнению, организовали фальсификацию уголовного дела. В противном случае любые, даже самые громкие заявления можно изначально считать необоснованными и бездоказательными.

КАПИТАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ КАПРЕМОНТА

Данила МЕСТИЧ

«Ежедневник» информирует, что в Беларуси при ежегодно сокращающемся финансировании капремонта, объёмы жилфонда, которые в нём нуждаются, увеличиваются. Даже в Минске, по данным КГК, в капремонте нуждаются уже более трети жилых домов. А на Могилёвщине ситуация с финансированием таких расходов является одной из самых плохих в стране. При сохранении текущих темпов проведения капремонта понадобится не менее 18 лет, чтобы привести в порядок жилые здания, построенные до 1975 года. За это время, естественно, придут в негодность более современные дома.



СТАРТ КАМПАНІІ ПА СТВАРЭННІ КЛАНА ЛАТЫФУНДЫСТАЎ У БЕЛАРУСІ

Рыгор КАСТУСЁЎ, намеснік старшыні Партыі БНФ

14 ліпеня 2014 года Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра, кіраўніка працоўнай групы па рэфармаванню сельскай гаспадаркі краіны, заявіў, што неэфектыўныя сельгаспрадпрыемствы будуць прыватызаваны ў выпадку, калі яны на працягу года не выйдуць на бязстратную працу. А 17 ліпеня ён падпісаў аж 4 Указы, падрыхтаваныя працоўнай групай для рашэння праблемных пытанняў у аграпрамысловым комплексе.

АПОШНІЯ КАЛГАСЫ

Адзін з іх - Указ №349 " Аб рэарганізацыі калгасаў (сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў)" - вызначае, што калгасы (СВК) да 31 снежня 2016 года належаць да пераўтварэння ў гаспадарчыя таварыствы або камунальныя прадпрыемствы. Пры гэтым, пры пераўтварэнні калгасаў у гаспадарчыя таварыствы, долі ў статутных фондах гэтага таварыства размяркоўваюцца паміж фізічнымі асобамі – членамі пераўтвараемага калгаса і адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай, на тэрыторыі якой ён размешчаны.

Такім чынам, пад выглядам "дабрачыннага" рашэння, на працягу двух з паловай год будуць ліквідаваны апошнія 347 яшчэ існуючых у Беларусі калгасаў. Напрыканцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў нашай краіне дзейнічала больш за 2,5 тыс. сельгаспрадпрыемстваў, з іх — каля 1,5 тыс. калгасаў.

Па словах міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Л. Зайца, Указ прэзідэнта па пераўтварэнню калгасаў спрасціць працэдуру продажу сельгаспрадпрыемстваў для прыцягнення інвестыцый. Дакумент створыць прававую нарматыўную базу для арганізацыі калгасамі новых суб'ектаў гаспадарання з мэтай "вываду іх на больш высокі ўзровень гаспадарання". Прыняццё такога дакумента, па словах міністра, вызвана яшчэ і тым, што на сённяшні дзень статуты калгасаў страцілі сваю значымасць і не адпавядаюць сучасным заканадаўчым нормам. Яны таксама ўваходзяць у супярэчнасць з Падатковым кодэксам.

На першы погляд, чытаючы падобныя рэляцыі, можа падасца, што беларуская дзяржава, беларускае чынавенства ўсяляк імкнуцца праявіць вялікі клопат аб сялянстве, аказаць яму неабходную падтрымку.

Але ж насамрэч гэта не так.

ПАД ВЫГЛЯДАМ РЭФОРМАЎ

Адначасовым прыняццём ажно 4-х Указаў па сельскай гападарцы (чаго ў гісторыі Беларусі яшчэ не назіралася), кіраўніцтва краіны практычна ўзаконіла рабаўніцтва сялянства, якое працягваецца ў нашай краіне пад выглядам правядзення рэформаў ужо больш 10 апошніх год.

Больш дзесяцігоддзя ў нашай краіне пад выглядам рэфармавання сельскай гаспадаркі інтэнсіўна ідуць працэсы зліцця двух-трох суседніх гаспадарак у адну і перавод новастворанага гаспадарак у гападаркі з новай формай ўлас-



насці. Былыя калгасы, саўгасы ператвараюцца ў ААТ (Адкрытыя акцыянерныя таварыствы), ЗАТ (Закрытыя акцыянерныя таварыствы), сельскагаспадарчыя кааператывы, якія надалей перадаюцца ў распараджэнне або ўласнасць новым гаспадарам..

Праз прыняццё новых заканадаўчых актаў, што не прадугледжваюць роўныя правы для грамадзян Беларусі па прыватнай уласнасці на зямлю, як і ў гады існавання савецкай улады, беларуская дзяржава імкліва выбівае з селяніна апошнія рэшткі пачуцця ўласніка, гаспадара свайго жыцця.

Як і ў далекія 20-ыя, 30-ыя гады мінулага стагоддзя ў часы калектывізацыі, калі сялянства сілай пазбаўлялася прыватнай уласнасці на зямлю, на сродкі вытворчасці і заганялася ў калгасы, беларускія ўлады зноўку прымаюць рашэнні па рэфармаванню сельгаспрадпрыемстваў, нават не цікавячыся меркаваннямі сённяшніх калгаснікаў і бессаромна пазбаўляюць сялян іх калектыўнай уласнасці.

ЯСКРАВЫ ПРЫКЛАД

Як гэта ўсё адбываецца? Ды вельмі проста…

Разгледзім гэты працэс на прыкладзе былога калгаса імя Фрунзэ Шклоўскага раёна, землі якога размяшчаюцца ўздоўж аўтадарогі Санкт-Пецярбург – Адэса.

Гаспадарка была створана ў далёкім 1929 годзе і заўсёды па выніках дзейнасці з'яўлялася адной з найлепшых у раёне. У 2002 годзе да яе быў далучаны суседні калгас "Запаветы Леніна". У 2003 годзе калгас быў пераўтвораны ў ЗАТ "Любініцкае".

Агульная плошча гаспадаркі склала 5602 га, з іх 5243 га — сельскагаспадарчыя ўгоддзі, у тым ліку ворыва — 4232 га. Агульная колькасць працуючых у гаспадарцы — 224 чалавекі.

У 2005 годзе пад выглядам "дабрачыннага ўчынка", быццам бы з мэтай выратавання былога калгаса і дапамогі былым калгаснікам, акцыі сельскагаспадарчага прадпрыемства ЗАТ "Любініцкае" набыло ААТ "Амкадор" з горада Мінск — буйнейшае на тэрыторыі СНД прадпрыемства па вытворчасці дарожнай і камунальнай тэхнікі . З гэтае пары сельгаспрадпрыемства стала называцца ЗАТ "Амкадор – Шклоў".

Такім чынам, у выніку калгаснікаў былога калгаса імя Фрунзэ пазбавілі калектыўнай уласнасці на маёмасць — тэхніку, пагалоўе буйной рагатай жывёлы, свіней, вытворчых памяшканняў і г.д. Зроблена ўсё гэта было такім жа чынам (хоць гэта зараз выглядае і прыгажэй), як калісьці гэта рабілі з іх дзядамі і прадзедамі ў далёкім 1929 г., заганяючы іх у калгас і пазбаўляючы прыватнай уласнасці.

Канчатковая ідэя ўсіх гэтых пераўтварэнняў, атрымаўшая па задумцы камбінатараў лагічнае завяршэнне, стала зразумелая толькі амаль праз восем год – 25 сакавіка 2013 года, калі на Беларускай валютна-фондавай біржы адбылася здзелка па продажы акцый ААТ "Амкадор". У выніку ўладальнікам 562 тысяч 457 акцый "Амкадора", што складае 53,64% статутнага фонду, стала наваполацкая кампанія ТАА "Інтэрсервіс", гаспадаром якой з'яўляецца Мікалай Варабей, прыбліжаны да А.Лукашэнкі.

Такім чынам, набыўшы кантрольны пакет акцый ААТ "Амкадор", М. Варабей стаў яшчэ аўтаматычна і "латыфундыстам" — уладальнікам вялікага сельскагаспадарчага прадпрыемства з тысячамі гектараў зямлі. І гэта не адзіная здзелка па прыватызацыі сельскагаспрадпрыемстваў у Беларусі. Прыхаваныя працэсы "прыхватызацыі" маёмасці ў нашай краіне ідуць поўным ходам, прычым, нярэдка бывае, сапраўднага гаспадара вылічыць вельмі складана. Пры гэтым беларускае чынавенства імкнецца пераканаць усіх нас, што зямля ў прыватную ўласнасць у Беларусі нікому не патрэбная.

МЭТА — МІЖКЛАНАВАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

Яшчэ больш нахабным вобразам абышліся з калгасам "1 Мая" Шклоўскага раёна , які тры гады таму назад быў далучаны да ААТ "Александрыйскае". На працягу двух дзён пасля ліквідацыі калгаса, у Александрыю была вывезена ўся жывела, тэхніка, абсталяванне, а пасля на працягу двух месяцаў зліквідавана, зцёртая з твару зямлі вытворчая база былога калгаса. А былыя калгаснікі з гаспадароў ператварыліся ў нікому непатрэбных беспрацоўных.

Падобным чынам беларускае чынавенства распарадзілася і з іншымі гаспадаркамі, як, напрыклад, быў ліквідаваны калгас імя Леніна Бялыніцкага раёна – у свой час адна з найлепшых гаспадарак краіны.

Стан "жабрака", а не гаспадара на сваёй зямлі замацоўваецца беларускім чынавенствам сярод сялянства яшчэ і праз мытарствы фермераў, праз навязванне думкі, што зямля беларускаму сялянству, як прыватная ўласнасць, нікому непатрэбна.

Такім чынам, рэпрэсуючы базавы ўласніцкі інстынкт беларускага сялянства, вышэйшае чынавенства краіны імкнецца дасягнуць адной мэты — здзейсніць у бліжэйшай перспектыве міжкланавую прыватызацыю зямлі…

НОВОСТИ РЕГИОНА

В АВТОМАТИЧЕСКОМ РЕЖИМЕ


С 1 июля на территории области стали функционировать 32 автоматических видеофиксатора, следящих за скоростью движения проезжающего транспорта. О том, где установлены видеокамеры, проинформировал mogilevnews.by. Вот места установки стационарных датчиков контроля скорости в Климовичском районе: Р43 Кричев–Бобруйск–Ивацевичи (км 13+950, д. Красовка); Р43 Кричев–Бобруйск–Ивацевичи (км 22+800, д. Домамеричи).

НЕ ХОТЯТ ТРАТИТЬ?

Три с половиной миллиарда рублей было выделено в этом году на обеспечение пожаробезопасного состояния жилья населения Могилёвщины. Об этом, ссылаясь на начальника областного управления МЧС, сообщил сайт Могилёвского облисполкома. Там же отмечается, что не во всех районах должным образом занимаются освоением выделенных денег. К примеру, в Климовичском районе средства на ремонт печей, электропроводки и установку автономных пожарных извещателей освоены в размере 22% от запланированного.

МАЛЕНЬКИЕ И КУСАЧИЕ

Мы уже предупреждали наших читателей о том, что в этом году необычайно рано активизировались клещи. Об этом же свидетельствуют обнародованные данные областного центра гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья. Согласно их сведениям: «Отмечается рост числа обращений в организации здравоохранения за медицинской помощью по поводу присасывания клещей в 1,8 раза по сравнению с аналогичным периодом 2013 года. Так, за 6 месяцев текущего года от укусов пострадало 2231 человека, в том числе 873 детей до 17-ти лет (6 мес. 2013 г. — 1197, в том числе детей — 393)».




ХЛОР ПАХНЕТ ОДИНАКОВО НЕПРИЯТНО

как в провинции, так и в столице

Александр ВЛАД

Немногие знают о том, что Генеральная Ассамблея ООН специальной резолюцией закрепила право человека на чистую питьевую воду. За это предложение проголосовали 122 государства. Организация Объединённых Наций рассматривает доступ к чистой и безопасной питьевой воде как общечеловеческое право, которое является необходимым условием полноценной жизни человека.



В Беларуси данная проблема не столь актуальна, но определённые издержки, тем не менее, имеются. Например, в Климовичах несколько лет назад на страницах районной газеты был поднят вопрос о ненадлежащем качестве питьевой воды в районе аграрного колледжа. В городе это место новостроек, кооперативные дома, общежития, детские сады. Поэтому вопрос закономерно привлёк внимание людей. Ответ на него был дан председателем райисполкома Виталием Гришановым: «Технически водопровод изношен более чем на 60%. Районным Центром гигиены и эпидемиологии проводится хлорирование скважин и водопроводных сетей через каждые 10 дней».

Как видим, даже наличие воды не во всех случаях является благом. У нас в Беларуси в ряде городов питьевой она становится только после предварительного хлорирования, что также не является выходом из положения. В связи с этим будет поучительно ознакомиться с историей борьбы жителей Минска за право пить чистую воду. Оказывается, и в столице не могут гарантировать людям доступ к воде без хлорки, хотя хлорированная вода вредна для человеческого организма, вызывает мутации и аномалии. Поэтому хлорирование систем водообеспечения вызывает вполне оправданную тревогу.

Сегодня минчане получают питьевую воду из источников двух типов — подземного и поверхностного. Артезианскую питьевую воду потребляет большая часть города, а нескольких районов столицы пользуются водой из поверхностных источников, которая проходит обработку хлором. Власти неоднократно заявляли, что в 2013 году Минск полностью перейдёт на подземные источники водоснабжения. Но в объявленном году переход на артезианскую воду не произошёл.

Вместо этого население услышало, что сроки ввода придётся передвинуть, возможно, ещё на несколько лет. Таким образом, жители трёх районов столицы (Фрунзенского, Московского и частично Октябрьского) по-прежнему остались с водой, обеззараживаемой хлором. Разумеется, такое известие не могло не вызвать возмущение. В августе прошлого года 570 жителей подписались под обращением в Мингорисполком. В обращении предлагалось организовать общественные слушания по данной проблеме с участием чиновников и депутатов парламента: «Требуем, чтобы нам были предоставлены планы и сроки по решению проблемы сильной хлорированности и загрязнённости водопроводной воды в наших квартирах» (цитируется по naviny.by).

Однако городские власти поступили по-своему. Были даны отписки, при этом главное требование — провести общественные слушания — игнорировалось. Ввиду этого минчане решили обратиться в суд. В марте 2014 года в суд Московского района Минска от имени подписавшихся людей подали жалобу. Горожане потребовали привлечь чиновников к ответственности. Но после рассмотрения жалобы, суд отказал гражданам в её удовлетворении.

Какой примечательный вывод можно сделать из этой истории? Показательно, что не политика, выборы или тому подобные вопросы, а обычные бытовые проблемы становятся в нашей стране камнем преткновения для взаимопонимания между обществом и власть имущими. Правящие верхи всё дальше отдаляются от нужд простых людей, не позволяя недовольным обеспокоить себя, в том числе, в судебном порядке. Только вот даже у привыкших ко всему белорусов может когда-нибудь закончиться терпение…

ЛЮБОВЬ НА ЗАМКЕ

Елена ПОЛЯКОВА

Сегодня многие городские мосты в Беларуси увешаны самыми разными замками и замочками. Традиция вешать замки на мосты в знак вечной любви пришла к нам из Европы. Особой популярностью эта примета пользуется во время свадебных церемоний.

По поверью, когда жених и невеста вешают замок на мост, они тем самым закрепляют узы брака. Вступающие в брак верят, что запирают свою любовь. Ключи по обычаю выбрасывают в реку, чтобы замкнуть чувства навсегда. Существует и такое мнение: если замок повесить на перила моста, а ключ от него выбросить в воду, то никто не сможет подобрать ключик к сердцу любимого человека.

В настоящее время пристёгивание замочка стало распространённой свадебной традицией, а изготовление замков с надписями специально под дату появилось в прейскурантах многих свадебных агентств. В некоторых городах власти даже определяют места для вывешивания замков. Несколько лет назад в Климовичах на мосту через Калиницу в одночасье появилось сразу пять замков. Так что и у нас есть желающие получить железную гарантию на своё супружество.

Кстати, в Минске и Бресте коммунальщики уже стали проводить акции по срезанию замков, так как опасаются повреждения мостовых конструкций. Нередко их набирается настолько много, что потом приходится сдавать в металлолом. А вот нашему мосту через речушку Калиницу такие нагрузки не грозят. За прошедшие несколько лет количество замков там существенно не изменилось. Не прижилась традиция или молодожены не верят, что таким образом можно укрепить брачные узы?

ГАНДЛЯРЫ — ЗБАНКРУТУЮЦЬ, ПАКУПНІКІ — СТРАЦЯЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ВЫБАРУ

Шмат для каго з прыватных прадпрымальнікаў патрабаванне мець на прывезеныя з Расіі тавары сертыфікаты якасці, якое толькі што пачало дзейнічаць, азначае банкруцтва. Асабліва цяжкімі могуць быць наступствы гэтага для жыхароў невялікіх гарадоў. Знайсці іншы занятак у райцэнтры дужа цяжка. Калі ў вялікіх гарадах прадпрымальнікі ўсё ж наважваюцца на акцыі пратэсту, то ў іхніх калегаў з глыбінкі абурэнне не выходзіць за межы гандлёвых павільёнаў. Якой бачыцца будучыня прыватнага гандлю ў памежных з Расіяй Клімавічах? На пытанне Радыё Свабода адказваюць прадпрымальнікі і пакупнікі іхніх тавараў.

У райцэнтры з пятнаццацітысячным насельніцтвам буйных гандлёвых дамоў няма. Невялікія раскіданыя ў цэнтральнай частцы гораду. Пакупнікоў у павільёнах няшмат. Настрой у гандляроў таварамі лёгкай прамысловасці пануры. Адзенне яны возяць пераважна з блізкай Расіі. Да мяжы — тры дзясяткі кіламетраў. Думкі пра абавязковую сертыфікацыю тавару ў прадпрымальнікаў розныя, але супадаюць у адным: іхні бізнес — на мяжы банкруцтва.

«Можа, улада хоча такім чынам узняць беларускія прадпрыемствы. А яшчэ каб не вывозілася і валюта. Альбо наагул хочуць нас як клас прадпрымальнікаў знішчыць — як канкурэнтаў знішчыць. Гэта ўсё адаб'ецца на пакупніках. Раней яны маглі купіць і таннейшы, і даражэйшы тавар. Цяпер жа выбару ў іх не будзе», — мяркуе адна з клімавіцкіх прадпрымальніц.

Суразмоўніца спрабуе гандляваць беларускімі таварамі, каб захаваць бізнес. Прызнаецца, што іншага выйсця не бачыць. Але пахваліцца ёй пакуль няма чым. Пра перспектывы кажа:

«Зразумела, выручка ад гандлю беларускім знізіцца. Калі мы будзем закупляць беларускі тавар, то цана, вядома ж, вырасце. І асартымент знізіцца. Вось у асартыменце ў нас джынсы ёсць, — даводзіць бізнесоўка, — а беларускія вытворцы джынсавага адзення не выпускаюць. Я наагул не ведаю такіх беларускіх фірмаў, адны толькі тыя, якія вырабляюць наш беларускі тэкстыль — сукенкі, спадніцы, пінжакі, нагавіцы».

Атрымаць неабходную дакументацыю на тавары ў Расіі цяжка, дый дорага, кажуць клімавіцкія гандляры. Некаторыя не хаваюць, што паволі будуць згортваць бізнес, калі не знойдуць іншых кірункаў для яго развіцця. Адзін з такіх заўважае:

«Улады хочуць, каб „чорныя грошы", якія мы не паказваем, будзем шчырымі, — гэтыя „чорныя грошы" вывесці вонкі, каб з гэтага нешта займець, бо сертыфікаты ж грошы каштуюць. Але я так думаю, што гэта толькі пагоршыць сітуацыю. Падаражэе тавар ад 20 да 70 працэнтаў адразу. Але ж самая галоўная праблема для нас усіх — гэта жабрацкае насельніцтва. І я перспектываў паляпшэння сітуацыі не бачу».

Ёсць сярод клімавіцкіх прадпрымальнікаў і такія, хто лічыць патрабаванне мець дакументы аб сертыфікацыі тавару добрай задумай. На іхную думку, пакупнік будзе ўпэўнены, што набывае якасны тавар:

«Выбачайце, вось на рынках кітайскія падробкі — дык гэта што, тавар? Няхай у нас тавар будзе і даражэйшы, але якасць будзе адпавядаць. Ёсць жа такая прымаўка: «Я не настолькі багаты, каб купляць танныя рэчы», — тлумачыць сваю пазіцыю адна з такіх гандлярак.

«Вось мы пенсіянеркі, — разважае суразмоўніца, — калі разумна траціць нашу пенсію, то яна прыстойная — два мільёны чатырыста тысяч. Мы цалкам нармальна можам існаваць на яе».

Наведнікі гандлёвых павільёнаў прызнаюцца, што не гатовыя набываць толькі беларускае. Выбару няма, ды яно й



дарагое, тлумачаць жыхары Клімавічаў:

«Хацелася б не толькі беларускага. У нас жа няма столькі беларускага тавару, які нам патрабуецца. Лепей было б, каб быў і беларускі, і маглі людзі набываць тое, што танней. З вёсак прыязджаюць у Клімавічы і хочуць купляць таннейшае. А вось беларускі тавар не заўсёды таннейшы», — даводзіць адна з пакупніц.

Як і па ўсёй Беларусі, у Клімавічах бацькі рыхтуюць дзяцей да школы. Вялікіх школьных кірмашоў у райцэнтры не будзе. Адна з пакупніц наведалася да прыватных гандляроў нагледзець школьную форму. Яна доўга разглядала тавар. На пытанне, якое б адзенне яна лепш выбрала свайму першакласніку, адзначыла:

«Выгадней набываць не беларускае, бо яно таннейшае. Да таго ж, наша беларускае — аднатыпнае. У прывазным тавары выбару болей. Няхай там і якасць не дужа добрая, але яго можна купіць танней і больш».

На думку суразмоўніцы, сертыфікацыю задумалі, каб прывучыць беларусаў насіць беларускае:

«Наша беларускае мала купляецца, таму і папрасілі зрабіць сертыфікацыю. А бальшыня ж людзей носіць прывазное і тое, што таннейшае».

Некаторыя пакупнікі ўсё ж не трацяць спадзеву, што некалі надыдзе час, калі беларускае адзенне стане больш разнастайным і недарагім.

«Вось як пачнуць усе зачыняцца, — кажа адна з такіх пакупніц, — і асартымент тавару тады стане шырэйшы. Тады будзем хадзіць і купляць толькі беларускае».

Суразмоўніца, аднак, не ўдакладніла, калі чаканае ёю стане рэальнасцю.



ТБМ ПРАПАНУЕ ВЯРНУЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ Ў ЗАКАНАДАЎСТВА

Сакратарыят грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» (ТБМ) звярнуўся да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з прапановай вярнуць беларускую мову ў заканадаўства.

Кампанія БелаПАН інфармуе, што ў звароце гаворыцца: «Зараз амаль усе законы ў нашай краіне прымаюцца толькі на рускай мове, не існуе афіцыйнага перакладу іх на дзяржаўную беларускую мову, што з'яўляецца парушэннем дзейнай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь».

У сувязі з гэтым і з улікам артыкулаў 1, 2 і 5 закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» ТБМ прапаноўвае з 1 верасня 2014 года ўсе законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты Нацыянальнага сходу адразу прымаць на дзвюх дзяржаўных мовах. ТБМ таксама прапаноўвае зрабіць афіцыйны пераклад дзейных законаў, якія былі прынятыя толькі на рускай мове, на дзяржаўную беларускую мову, апублікаваўшы іх у прадугледжаным законам парадку.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў у размове з БелаПАН зазначыў, што аб'яднанне і раней кантактавала з дэпутатамі наконт вяртання беларускай мовы ў заканадаўства. «Нам абяцалі прыняць адпаведныя папраўкі ў закон аб мовах, але пакуль гэта не зроблена», — сказаў ён. Разам з тым Трусаў зазначыў, што ў ТБМ ёсць прыклады станоўчага супрацоўніцтва з парламентам. У прыватнасці, былі прынятыя папраўкі ў закон аб зваротах грамадзян, у адпаведнасці з якімі на зварот на беларускай мове адказ павінен прыходзіць таксама на ёй.

ЭКС-МИНИСТР ОСУЖДЕН ЗА ПОДАВЛЕНИЕ АНТИКОММУНИСТИЧЕСКОГО МЯТЕЖА

Бывший венгерский министр внутренних дел осужден на пять с половиной лет лишения свободы за военные преступления во время подавления антикоммунистического мятежа в 1956 году. 92-летний Бэла Бижку (Bela Biszku) был признан виновным в том, что отдал приказ силам безопасности открыть огонь по гражданским лицам, сообщает Би-би-си.

В результате восстания было свергнуто правительство коммунистов, однако затем последовало военное вмешательство СССР. В декабре 1956 года 49 человек погибли, когда вооруженные отряды открыли беспорядочный огонь по двум скоплениям людей, в Будапеште и городе Шальготарьян. Именно эти эпизоды вменялись Бижку в вину.

Это — первый судебный процесс в Венгрии, где обвиняемым является бывший высокопоставленный чиновник тогдашнего режима. Бижку был членом временного исполнительного комитета, который создал отряды для подавления восстания, и сейчас он единственный оставшийся в живых член этого органа. Приговор в силу не вступил, осужденный еще может подать апелляцию.

ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: КНІГІ, ГАЗЕТЫ, ЧАСОПІСЫ, АЎДЫЁ, ВІДЭА

Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, часопісы, аўдыё і відэа. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012, 2013 і 2014 гг.



kamunikat

Беларуская Інтэрнэт–Бібліятэка


МІНІСТР МУС УКРАІНЫ ЗВОЛЬНІЎ 585 ДАНЕЦКІХ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ



Радыё Свабода паведамляе, што звольненыя супрацоўнікі праваахоўных органаў Данецкай вобласці не прайшлі праверку на вернасць прысязе і службе Украіны.

Супраць сотняў міліцыянераў будуць распачатыя крымінальныя справы. Міністр унутраных спраў Украіны Авакаў паведаміў у фэйсбуку пра звальненне сотняў данецкіх праваахоўнікаў.

«585 супрацоўнікаў міліцыі звольненыя. У дачыненні большасці з гэтага склада служачых будуць распачатыя крымінальныя справы. Дадатковая праверка праводзіцца яшчэ па 242 супрацоўніках, якія доўгі час знаходзяцца на „бальнічным“. Будзе дадзеная прынцыповая ацэнка іхняй адсутнасці і забеспячэння грашовым утрыманнем. Важна, каб настолькі масавае здрадніцтва і нягодныя паводзіны не падалі негатывам аўтаматычна на тых вартых міліцыянераў, што служаць Украіне! У гэтай сітуацыі ёсць месца здрадзе і нізкасці — але ёсць месца годнасці і подзвігу» — піша міністр.



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна